# КУЛЬША МАТРОНА ФЕДАРАУНА



Вайна чорным сваім крылом накрыла кожную беларускую сям'ю. Матрона Фёдараўна і Антон Сцяпанавіч – мае прабабуля і прадзядуля. Да вайны яны жылі недалёка ад Мінска, пад Смалявічамі. А перад самай вайной пераехалі пад Лагойск.

У кожнага свае адмеціны вайны. Мая прабабуля, калі бегла ў лес са сваімі дзецьмі – маёй бабуляй, Верай і яе старэйшым братам Леанідам, трапіла пад бамбардзіроўку фашысцкіх самалётаў. Схаваўшы дзяцей у баразну, Матрона Фёдараўна прыкрыла іх сабой. Адна з куль прабіла ёй нагу наскрозь і ў яе да самай смерці была гэтая адмеціна вайны.

Прадзядуля сышоў на вайну ўлетку 1941 года, як толькі ў невялікай вёсцы Лагойскага раёна даведаліся аб яе пачатку. На жаль, лёс не збярог Антона Сцяпанавіча. «Прапаў без вестак, лічыцца загінулым у баі». Гэта стала вядома праз сястру прадзеда Зінаіде Сцяпанаўне, якая працавала ў Смаленску ў ваенным шпіталі. Яна не ведала ні пра брата, які быў зусім блізка ад яе, ні пра яго жонку, якая з двума маленькімі дзецьмі выжывалі на акупаванай тэрыторыі. Як аказалася, мой прадзед трапіў у Смаленскі кацёл. Прадзядулю прывёў у вёску немяц, ён быў у цяжкім стане, быў паранены ў галаву. Па ўспамінах відавочцаў, усё, што мог сказаць салдат: «Тут, тут мая сястра жыве». Але яго сястры не было дома. Незнаёмыя з ім вяскоўцы, якія толькі чулі пра яго, не сталі браць на сябе адказнасць ратаваць савецкага салдата на ўжо захопленай тэрыторыі. Выпадак вырашыў лёс майго прадзеда – ці ён апынуўся ў палоне ці быў расстраляны.

За вайной прыйшоў цяжкі перыяд аднаўлення. Матрона Фёдараўна з дзецьмі жыла спачатку ў маленькай хаце з земляной падлогай, у вялікі дом атрымалася пераехаць толькі праз паўтара года. Матрона Фёдараўна працавала ў калгасе даяркай. Мая бабуля, Вера Антонаўна, працавала кранаўшчыца на МАЗе, а яе старэйшы брат Леанід – элетрыкам на заводзе «Магілёўліфтмаш». На жаль, дзеці амаль не памяталі бацькі, але яго імя і подзвіг захаваліся ў нашай сям'і.








Материал подготовила:
Мурашко Лидия Андреевна,
ФММП, группа 10507220

Белорусский национальный технический университет

Управление по воспитательной работе с молодежью

Выставка "История Великой
Отечественной войны в лицах"

Л. А. Мурашко

# КУЛЬША
# МАТРОНА ФЁДАРАЎНА

Минск БНТУ 2021